Н. ЛЯЙКО
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў БДУКМ

# Бібліятэка-знаўца і паэтка

## 75 гадоў з дня нараджэння і 50 гадоў творчай дзейнасці Л. А. Дзямешка



**Лілія Адамаўна Дзямешка — вядомы беларускі бібліятэказнаўца, вучоны, педагог. 50 гадоў творчай дзейначці Л. А. Дзямешка — гэта гады назапашвання духоўнага багацця, навуковага пошуку, распрацоўкі шэрагу праблем бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.**

Нарадзілася Лілія Адамаўна Дзямешка (Ляневіч) 30 сакавіка 1938 г. у вёсцы Замагілле Чырвонаслабодскага (цяпер Салігорскага) раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Але сваёй маленькай радзімай лічыць Уздзеншчыну, дзе яна закончыла сярэднюю школу, дзе прайшлі юнацкія гады, адкуль яна пайшла ў самастойнае жыццё. Пасля заканчэння бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута ім. А. М. Горкага працавала інспектарам па бібліятэчнай рабоце ў Мінскім абласным упраўленні культуры, галоўным бібліятэкарам у навукова-метадычным аддзеле Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.



Пасля заканчэння аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце ім. А. М. Горкага і паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі ў 1976 г. Л. А. Дзямешка працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый на кафедры бібліятэказнаўства (цяпер кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы) на пасадах выкладчыка, старэйшага выкладчыка, дацэнта. З 1994 г. яна працуе на пасадзе прафесара кафедры.

Лілія Адамаўна не толькі вядомы бібліятэказнаўца ў нашай краіне, якую добра ведае і старэйшае пакаленне бібліятэкараў, калі яна працавала ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР у якасці метадыста, рыхтавала шэраг публікацый па пытаннях удасканалення практычннай дзейнасці бібліятэк, але і маладшае — выпускнікі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, у якіх яна выкладала шэраг вучэбных дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла. Характэрнай рысай Ліліі Адамаўны з'яўляецца творчы падыход да педагагічнай і навуковай дзейнасці, які садзейнічае перспектыўнаму развіццю бібліятэчна-інфармацыйнай сферы нашай краіны. Гэта праяўляецца ў яе публікацыях, а іх ужо болей трохсот, сярод якіх — манаграфічныя выданні, вучэбныя і метадычныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы, праграмы і метадычныя ўказанні для студэнтаў. У тым ліку: манаграфія «Интернациональное воспитание молодёжи», шэраг вучэбных дапаможнікаў па розных раздзелах бібліятэказнаўчых дысцыплін: «Бібліятэка і вольны час», «Менеджмент школьной библиотеки», «Бібліятэчная рэклама». Па адным з асноўных курсаў бібліятэказнаўства быў падрыхтаваны вучэбны дапаможнік «Бібліятэчнае абслугоўванне» (у сааўтарстве).

У артыкулах Л. А. Дзямешка разглядаюцца актуальныя пытанні бібліятэказнаўства: дзейнасць публічных бібліятэк Беларусі, выхаванне ў чытачоў нацыянальнай самасвядомасці, культура чытання, далучэнне да нацыянальнай культуры, беларускай літаратуры і іх роля ў патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў, дзейнасць дзіцячых і школьных бібліятэк на сучасным этапе, удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў і інш.

Значную ўвагу ў сваёй дзейнасці Лілія Адамаўна ўдзяляе распрацоўцы тэрміналогіі ў галіне бібліятэчнай справы, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства. У сааўтарстве з прафесарам В. Е. Лявончыкавым падрыхтаваны і выдадзены ўпершыню ў Беларусі «Русско-белорусский словарь библиотечных терминов» (1992 г.), а ў 2012 г. з'явіўся ў друку «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў», трэцяе выданне, выпраўленае і дапоўненае (у сааўтарстве з В. Е. Лявончыкавым і Р. І. Саматыя), які будзе карысны бібліятэкарам і бібліёграфам, работнікам навукова-тэхнічнай інфармацыі і кніжнай справы, выкладчыкам, аспірантам, магістрантам і студэнтам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дадзенага профілю.

Творчая натура Ліліі Адамаўны праяўляецца ва ўсім. Яна пісала вершы яшчэ ў студэнцкія гады, якія прысвячала сваім сябрам. Лілія Адамаўна піша і цяпер, яна — паэтэса, не пісаць вершы не можа. У іх пра тое, што яе турбуе, чаму душа баліць. Аб гэтым сведчаць не толькі асобныя публікацыі ў перыядычных выданнях і зборніках. Лепшым падарункам да юбілею Л. А. Дзямешка з'яўляецца зборнік вершаў «Мне жыццё ўяўляецца полем...». У яго ўключаны лепшыя вершы Ліліі Адамаўны, прысвечаныя Радзіме, сябрам, калегам.

Аб творчай і добразычлівай натуры сведчаць такія радкі яе верша:

*Але што б ні было там у роспачы,*
*Калі й марыць ужо не з рукі,*
*Пад нагамі на полі я бачу*
*Не калдобы, а больш васількі.*

*Дарагая Лілія Адамаўна!*
*Будзь заўсёды аптымістам!*
*Прымі самыя шчырыя пажаданні — моцнага здароўя, дабрабыту, рэалізацыі ўсіх творчых планаў і ідэй, поспехаў ва ўсім.*
*Няхай цябе заўсёды радуюць твая дачушка, унукі, праўнучка і сябры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ